4. Ладыгин, Л. А. О музыкальном содержании учебных форм танца: метод. пособие / Л. А. Ладыгин. – М. : МГК, 1993. – 189 с.

**Палюкас Н. В.,** студэнт
навуковы кіраўнік – Раманенкава В.І.

## ЖАНРАВЫЯ АСБЛІВАСЦІ І МУЗЫЧНАЯ СТЫЛІСТЫКА КАЗАЦКІХ ПЕСЕНЬ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Гістарычныя землі сучаснай Беларусі зведалі выхадцаў розных краін і канфесій, што знайшло свой адбітак у культуры, мастацтве і фальклоры беларусаў. З XVII ст. на тэрыторыі тагачаснай Беларусі пачалі з‘яўляцца першыя казачыя атрады, якія прымалі ўдзел у ваенных паходах супраць татар і туркаў. Паступова побыт і культура казакоў пачала ўкараняцца ў Беларусі.

У музычнай фалькларыстыцы існуе тэндэнцыя некаторага зневажання ролі, якую займае ―пласт” казацкай лірыкі ў беларускай нацыянальнай песнятворчасці, нягледзячы на ―небеларускае” паходжанне казацкай песні.

Аднак, Лідзія Мухарынская – вядомы беларускі фалькларыст, сцвярджае, што на тэрыторыі Беларусі нават самыя пашыраныя паэтычныя сюжэты казацкай песні атрымліваюць новы, беларускі напеў і становяцца фактам беларускага народнага ―песнепісання” [5, с. 20–21].

Упершыню каля 20 казацкіх песень апублікаваў рускі фалькларыст – Пётр Гільтэбрандт (1840–1905 гг.). Пазней быў выдадзены зборнік сацыяльна-бытавых песень ―Беларускі зборнік” (―Белорусский сборник”, 1886. Вып. 1-2) этнографам і фалькларыстам Еўдакімам Раманавічам Раманавым. Тут змешчана каля 30 тэкстаў казацкіх песень.

Казацкім песням характэрна: шырыня, сцвяржальнасць інтанацый, свабода гучання. Песні вызначаюцца свабодалюбствам, маршавым, нават нейкім заліхвацкім тэмпам, рытмам. Падмацоўваецца гэта і шматлікімі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

клічнымі інтанацыямі. Але казацкія песні не толькі заліхвацкія, важна адзначыць, што яны працяжныя і шматгалосныя, для іх характэрна лірычнае захапленне, паўнагучнасць, пачуццёвая прыгажосць. Асаблівасцю казацкай песні з‘яўляецца яркая воклічнасць, наяўнасць працяжных гучных –рэх”, мяккае заміранне гучнасці пасля сакавітых акордавых спалучэнняў [1, с. 416–418].

Беларускія казацкія песні даволі цяжка класіфікаваць. Магчыма, абаперціся на класіфікацыю ўкраінскіх песень гэтага віду, якую зрабіла В. Хмялеўская. У зборніку «Казацкія песні» яна класіфікуе ўкраінскія казацкія песні па тэматычным прынцыпе: «Зборы у паход; У паходзе і баях; Казацкі побыт; Казацкая смерць; Знішчэнне Сечы; Сум па свабодзе». Аднак такую класіфікацыю можна прыняць толькі ўмоўна, таму што, напрыклад, казацкі побыт паказваецца не толькі ў тых песнях, якія адносяцца менавіта да гэтай групы, але і ў іншых – у песнях пра падрыхтоўку да паходу. Вяртаючыся з далёкіх паходаў, казакі прывозілі новыя песні, якія вельмі хутка распаўсюджваліся. Усё гэта спрыяла фарміраванню адмысловага песеннага фальклору – «мужчынскай» песні.

У беларускіх казацкіх песнях выявіліся нацыянальныя асаблівасці беларускай песнятворчасці. Зыходзячы з тэматычнага прынцыпу, такія песні можна класіфікаваць па групах: адыход казака на службу і на вайну; развітанне казака з жонкаю, маці, нявестаю; казак у бітвах; вяртанне або смерць казака на полі бою.

У тэкстах многіх беларускіх народных песень казак з‘яўляецца галоўнай дзеючай асобай. Гэтыя песні носяць павучальны характар і апавядаюць пра некаторыя бакі жыцця мужчын-казакоў. Сярод іх песні пра казака, які збіраецца на вайну, пра непадзельнае каханне. І ў гэтых песнях казак выяўляецца незвычайна ярка.

Сярод беларускіх казацкіх песень вылучаюцца паходныя, рытмізаваныя, задорныя песні саміх казакоў і лірычныя, бытавыя, часта трагічныя з баладнымі элементамі песні іх родных: маці, сястры, жонкі [1, с. 417].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як сведчаць дадзеныя многіх фальклорных экспедыцый, досыць шмат песень, звязаных з казацтвам, існавала і захавалася да нашых дзён на Палессі. Гэта вельмі разгорнуты гісторыка-стылявы пласт песеннага фальклору Палесся, які складаюць песні запазычаныя з казацкага фальклору, а таксама тыя, што нарадзіліся на дадзенай тэрыторыі ў эпоху фарміравання беларускай народнасці XIV–XVI стст. і часы казача-сялянскіх паўстанняў XVI–XVII стст. За кожным паэтычным тэкстам замацаваны адзін або некалькі самастойных індывідуальна-афарбаваных напеваў. Іншая, вызначальная асаблівасць гэтых песень складаецца ў тым, што з імі звязана шырокае развіццё шматгалосся ў беларускім песенным фальклоры, цэнтральнай зонай якога з‘явілася менавіта Палессе [4, с. 150–152].

Трэба спыніцца на некаторых адметных стылявых асаблівасцях, характэрных для Палесся і казацкіх песень навогул. А менавіта, харавая партытура шматгалосных песень Палесся складаецца з дзвюх абавязковых партый з выразнай спецыфікацыі кожнай з іх. Асноўны напеў, што выконваецца хорам гучыць заўсёды ў ніжнім голасе, які падчас шматгалоснага распеву нярэдка разгаліноўваецца. Верхні голас, што саліруе, кантрапунктуе харавому ніжняму па прынцыпе адмысловага спаборніцтва з ім.

Усведамленне мастацкай функцыі галасоў казацкіх песень замацавана ў адмысловай народнай музычнай тэрміналогіі: спяваць ніжнюю партыю – «басаваць», «туравать», «граміць», адпаведна, сам ніжні голас «басуючы», «туруючы», «грамлючы». Спевакі, якія выконваюць асноўны напеў у ніжнім голасе – басы. Спяваць верхні голас, які саліруе – “надводзіць”, “наднімаць” “браць на падгалосак”, “выцягаць”, адпаведна сам верхні голас – “надводка”, “надгалоснік”, выканаўца верхняга голасу таксама “надводка” ці “надводчык”, “галаснік” ці “гаравік” [4, с. 151–152].

Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што найбольш распаўсюджаным жанрам казацкай музыкі на тэрыторыі Беларусі трэба лічыць лірычную казацкую песню, якая адносіцца да традыцыйнай лірыкі беларусаў – адна з найбольш змястоўных і прыгожых старонак ў летапісе сялянскага жыцця на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі, каштоўная культурная спадчына мінулага, у якой яскрава адбіўся і своеасаблівы нацыянальны менталітэт, і паэтычна-песенны талент беларускага народа.

Казацкі фальклор, прайшоў тысячагадовы шлях развіцця, адрозніваецца незвычайным багаццем і своеасаблівасцю формаў, тэм, сюжэтаў, што адлюстроўваюць працу і побыт, уяўленні і ідэалы казакоў у іх гістарычнай змене.

Шмат беларускіх народных песень, якія бытавалі і бытуюць на Беларусі адносяцца да казацкіх песень, але адначасова такое сцвярджэнне (аб прысутнасці вялікай колькасці казацкіх песень на тэрыторыі Беларусі) выклікае шмат сумніваў у сучасных даследчыкаў.

Такім чынам, трэба адзначыць, што і сёння вельмі папулярная мужчынская сацыяльная лірыка, а менавіта казацкія песні. Беларускія казацкія песні можна пачуць у выкананні фольк-гурта “Рада”, шоў казацкай песні і танца “Маме нравится”, ансамбля казацкай песні “Бацька Атаман”, гуртоў “Гуляй казак”, “Церніца”, “Ігрыца”, “Меністрэлі”, “Вольніца”, поп-фольк гурта “Лялькі карпарэйшн”, а таксама вучэбных калектываў “Валачобнікі”, “Грамніцы”, “Беларуская песня”. Апрацоўкамі казацкіх беларускіх песень займаюца беларускія кампазітары і фалькларысты, напрыклад: К. Яськов, У. Зяневіч, М. Сірата, У. Куксінкоў, Г. Несцяровіч і інш. Таксама трэба адзначыць такую падзею ў культурным жыцці беларусаў, як праект “Традыцыі” у рамках якога людзі разам з прафесійнымі спевакамі выконваюць як абрадавыя, так і пазабрадавыя беларускія, у тым ліку казацкія народныя песні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыц. жанры: Гомел. вобл. / Уклад. В.А. Захарава і інш.; Уклад. муз. часткі У.І. Раговіч. – Мн. : Універсітэцкае, 1989. – 384 с.: іл., нот іл., 286 – 288 с.

2. Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыц. жанры: Мінск. вобл. / Уклад. В.Д. Ліцвінка; Уклад. муз. часткі Г.Р. Кутырова. – Мн. : Універсітэцкае, 1995. – 477 с.: іл., нот. іл., 416 – 418 с.

3. Гурскі, А.І. Пазаабрадавая паэзія / А.І. Гурскі, Г.А. Пятроўская, Л.М. Салавей; Навук. рэд. А.С. Фядосік. – Мн. : Бел. навука, 2002. – 564 с.

4. Мажэйка, З.Я. Песенная культура беларускага палесся. Сяло Тонеж / З.Я. Мажэйка. − Мн. : Навука і тэхніка, 1971.− 264 с.

5. Мухарынская, Л.С. Беларуская народная музычная творчасць / Л.С. Мухарынская, Т.С. Якіменка. – Мн., 1993. – 258 с.

**Пацевич Е.Г.,** студент

Научный руководитель – Бигеза В.М.

## ИЗУЧЕНИЕ МЕЖЛИЧНОСТНОГО ОБЩЕНИЯ СТАРШИХ ПОДРОСТКОВ В УСЛОВИЯХ БИБЛИОТЕКИ

Понятие «общение» является достаточно широким по объему и интерпретируется исследователями по-разному, оно определяется как сложный и многоплановый процесс установления и развития контактов между людьми, который порождается потребностями в совместной деятельности и включает в себя обмен информацией, выработку единой стратегии взаимодействия, восприятия партнера [2].

В условиях библиотеки у подростков складывается особое межличностное общение, которое в большинстве случаев является позитивным и благотворно влияет на развитие подростка.

В Концепции непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи Республики Беларусь отмечается, что учреждения внешкольного образования и воспитания (к которым относятся библиотеки) предоставляют подрастающему поколению самые разнообразные услуги интеллектуального, духовного, рекреационного характера. Они обеспечивают реальные и дифференцированные возможности духовного и физического развития детей и молодежи [4]. В Концепции гуманистического воспитания в одном ряду с деятельностью и отношениями общение называется как важнейшее средство

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ